УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
____________А.И. Жук
«20» 12 2024 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-1-92/2024/буч.

# СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА XVII–XIX СТАГОДДЗЯЎ

**Вучэбная праграма**
**ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя**
**(Беларуская мова і літаратура);**
**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя**
**(Беларуская мова і літаратура. Замежная мова**
**(з указаннем мовы))**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)), зацверджаных 23.02.2023, рэг. № 050 – 2023/у, рэг. № 048 – 2023/у, рэг. № 49 – 2023/у

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Т.М.Тарасава, прафесар кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар філалагічных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Г.К.Тычко, прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ, доктар філалагічных навук, прафесар;
Н.У.Чайка, прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар філалагічных навук, прафесар

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар
ДУА «Сярэдняя школа № 191 г. Мінска» ____________ Ю.І.Пінчук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 3 ад 29.10.2024 г.)

Загадчык кафедры ________________________ І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 2 ад 24.12 2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых
яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела БДПУ ________________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ________________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Сусветная літаратура XVII–XIX стагоддзяў» прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбнымі планамі падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура); 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)).

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з канцэпцыяй літаратурнай адукацыі, садзейнічае фарміраванню ў студэнтаў самастойнасці меркаванняў, вучыць выказваць і адстойваць уласныя погляды і думкі, аргументаваць іх, абапіраючыся на канкрэтныя навуковыя факты.

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.**

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны «Сусветная літаратура XVII–XIX стагоддзяў» – раскрыць багацце, шматстайнасць, непаўторнасць сусветнай літаратуры на розных этапах яе развіцця, а таксама ў яе сувязях з літаратурным працэсам у Беларусі; акрэсліць месца беларусаў у свеце і прадстаўнікоў іншых народаў у Беларусі, убачыць беларускую літаратуру сярод літаратур замежных краін на розных этапах іх развіцця, зразумець, што новае ў прачытанні сусветна вядомых аўтараў адкрылі беларусы, якім чынам беларуская літаратура і яе творцы ўздымаюць на новы ўзровень духоўныя каштоўнасці народаў свету.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– акрэсліць асноўныя этапы, заканамернасці літаратурнага працэсу ў розных рэгіёнах свету, іх канкрэтна-гістарычны і разам з тым «вечны» сэнс;

– абазначыць тыпалагічныя адметнасці вядучых літаратурна-мастацкіх кірункаў, плыняў, школ, што знайшлі сваё ўвасабленне ў прадстаўнікоў іншых народаў і пакаленняў;

– даць звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, якія адыгралі асаблівую ролю ў сусветным літаратурным працэсе;

– ахарактарызаваць асноўныя творы замежных пісьменнікаў, якія складаюць «залаты фонд» літаратуры, выявіць іх агульначалавечы змест, актуалізаваць іх значэнне ў айчынным літаратурным працэсе;

– раскрыць сэнсавую глыбіню, шматзначнасць і непаўторнасць тых вобразаў замежных пісьменнікаў, якія набылі агульначалавечае значэнне, «новае жыццё» ў кантэксце іншанацыянальных літаратур і ў творчасці прадстаўнікоў розных пакаленняў;

– выявіць нацыянальную адметнасць і разам з тым акрэсліць агульнае ў змястоўна-фармальнай структуры твораў пісьменнікаў народаў свету.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.**

Вучэбная дысцыпліна «Сусветнай літаратуры XVII–XIX стагоддзяў» адносіцца да модулю «Сусветны літаратурны працэс» і ўваходзіць у кампанент

установы вышэйшай адукацыі. Згодна вучэбным планам па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура); 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)) вучэбная дысцыпліна «Сусветная літаратура XVII–XIX стагоддзяў» уваходзіць у цыкл спецыяльных вучэбных дысцыплін і вывучаецца студэнтамі ў чацвёртым семестры побач з дысцыплінамі сацыяльна-гуманітарнага блока, што дае магчымасць выкарыстоўваць набытую інфармацыю ў працэсе засваення дадзенай дысцыпліны.

Вучэбная дысцыпліна «Сусветная літаратура XVII–XIX стагоддзяў» мае генетычна абумоўленыя сувязі з дысцыплінамі літаратуразнаўчага цыклу – «Уводзіны ў літаратуразнаўства», «Гісторыя беларускай літаратуры XVII–XVIII стагоддзяў», «Гісторыя беларускай літаратуры XIX стагоддзя». Атрыманыя веды дазволяць сфарміраваць у студэнтаў уяўленне пра непарыўнасць літаратурнага развіцця ў маштабах агульначалавечай культуры і яго дыскрэтнасць у адлюстраванні асаблівасцей пэўных эпох і народаў, зразумець, што літаратура – гэта незаменны сродак фарміравання маральна-каштоўнасных арыенціраў маладога чалавека, яго духоўна-эстэтычнага патэнцыялу, творчай запатрабаванасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

– асноўныя літаратурныя эпохі, кірункі, стылі, іх асаблівасці;

– этапы і заканамернасці сусветнага літаратурнага працэсу, асаблівасці літаратуры еўрапейскіх краін і краін амерыканскага кантынента;

– традыцыйнае і наватарскае ў сусветным літаратурным працэсе на розных этапах яго развіцця, у творчасці прадстаўнікоў аднаго кірунку, таго ці іншага пісьменніка;

– жыццёвы і творчы лёс пісьменнікаў, якія аказалі найбольшы ўплыў на развіццё сусветнага літаратурнага працэсу;

– тэксты замежных пісьменнікаў, якія прапануюцца для абавязковага прачытання;

– факты і спецыфіку функцыянавання сусветнай літаратурнай класікі ў беларускай культуры.

***умець:***

– выяўляць агульнае і асаблівае ў развіцці сусветнага літаратурнага працэсу ў яго суадносінах з нацыянальным;

– вызначаць тыпалагічныя асаблівасці, характэрныя для таго ці іншага літаратурнага кірунку, метаду, стылю;

– аналізаваць твор у кантэксце эпохі, кірунку, творчасці пісьменніка;

– аналізаваць мастацкі твор з пазіцый яго фармальна-змястоўных кампанентаў;

– характарызаваць спадчыну пісьменніка, яго сюжэты і вобразы праз іх успрыманне, інтэрпрэтацыю ў творчасці прадстаўнікоў іншай эпохі і нацыі;

***валодаць:***

– адпаведным паняційным і тэрміналагічным апаратам;

– навыкамі розных спосабаў аналізу літаратурнага твора;

– навыкамі навуковай дыскусіі, прэзентацыі даследчых вынікаў і праектных рашэнняў;

– сучаснай методыкай і метадалогіяй літаратуразнаўчых даследавання.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сусветная літаратура XVII–XIX стагоддзяў» павінна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура) наступнай кампетэнцыі:

СК 10. Характарызаваць асаблівасці развіцця нацыянальных літаратур на розных гістарычных этапах, улічваючы заканамернасці літаратурнага працэсу замежных краін як цэласнай з’явы.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сусветная літаратура XVII–XIX стагоддзяў» павінна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)) наступнай кампетэнцыі:

СК 6. Характарызаваць асаблівасці развіцця нацыянальных літаратур на розных гістарычных этапах, улічваючы заканамернасці літаратурнага працэсу замежных краін як цэласнай з’явы.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Сусветная літаратура XVII–XIX стагоддзяў» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сусветная літаратура XVII–XIX стагоддзяў» адведзена:

– для дзённай формы атрымання адукацыі 108 гадзін, з іх 56 аўдыторных гадзін. Размеркаванне гадзін па відах занятасці:

лекцыі – 28 гадзін, практычныя заняткі – 28 гадзін.

52 гадзіны адведзена на самастойную работу студэнтаў.

Працыёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

Прамежкавая форма атэстацыі праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці ў форме заліка ў IV семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Тэма 1. XVII стагоддзе і літаратурны працэс. Барока*

Крызіс гуманізму. Літаратурная барацьба. Фарміраванне асноўных літаратурных кірункаў. Барока як мастацка-эстэтычная сістэма. Барока ў Іспаніі: П. Кальдэрон, яго рэлігійна-філасофскія (гісторыка-філасофскія) драмы. Жанр махлярскага рамана ў іспанскай літаратуры. Барока ў Германіі: паэзія Трыццацігадовай вайны (М. Опіц, П. Флемінг, А. Грыфіус, Ф. Логау, народная песня): асноўныя матывы, вобразы. Раман Грымельсгаўзена «Сімпліцысімус»: дваістасць чалавека і свету.

Пераклады на беларускую мову. Барока ў славян і беларусаў. Буйнейшы прадстаўнік – Сімяон Полацкі. «Высокае» і «нізкае» барока.

### *Тэма 2. Класіцызм*

Філасофская аснова – картэзіянства. Гістарычныя этапы ў развіцці класіцызму ў Францыі. Тэорыя класіцызму Н. Буало. Оды Ф. Малерба, байкі Ж. Лафантэна. Маральная праблематыка ў прозе французскіх класіцыстаў: М. Лафайет («Прынцэса Клеўская»), Б. Паскаль («Думкі»), Ф. Ларашфуко («Максімы»), Ж. Лабруер («Характары, або Норавы нашага стагоддзя»). Жанры трагедыі (П. Карнель, Ж. Расін) і камедыі (Мальер). «Сід» Карнэля як узор літаратуры класіцызму 1-га перыяду. «Андрамаха» Расіна – новая канцэпцыя ў класіцызме 2-га перыяду.

Мальер: асноўныя этапы жыцця і творчасці. Драматургічная рэформа Мальера. Камедыі «Скупы», «Тарцюф», «Мешчанін у дваранах», «Дон Жуан» і іншыя: традыцыйнае і наватарскае. Камедыі Мальера на беларускай сцэне. Перайманне сюжэтаў і вобразаў Мальера ў п’есах беларускіх аўтараў (Ф. Уршуля Радзівіл і інш.).

Літаратура Англіі. Традыцыі барока і класіцызму. Дж. Мільтан: звесткі з жыцця і творчасці. Паэма «Страчаны рай». «Ад вовне и Ад внутри»: Сатана. Вобразы Адама і Евы, матывы спакушэння і грэхападзення. Тэматыка «Вернутага раю».

### *Тэма 3. XVIII стагоддзе: Асветніцтва*

XVIII стагоддзе і яго месца ў гісторыі сусветнай літаратуры. Асветніцтва як комплекс ідэй у культурным руху Еўропы. Сувязь літаратуры з філасофіяй і эстэтыкай. Асноўныя літаратурныя кірункі. Водгукі барока ў камедыях плашча і шпагі К. Гоцы, жанр тэатральнай казкі – ф’ябы. Мастацтва ракако (паэзія кахання Э. Парні, элементы ў «Арлеанскай нявінніцы» Вальтэра). Асветніцкі класіцызм: роля грамадства, ідэя выхавання чалавека. Новы тып героя – мудраца, інтэлектуала (Вальтэр, «Рымскія элегіі» Гётэ). Асветніцкі рэалізм: вывучэнне сацыяльнага становішча чалавека і яго лёсу ў грамадстве, сацыяльна актыўны герой, дзейснае адстойванне ім сваіх інтарэсаў, герой як прадстаўнік саслоўя, праблема яго эвалюцыі. Сентыменталізм як напрамак Сталага Асветніцтва: культ пачуццяў, культ прыроды, ідэалізацыя патрыярхальнага

сялянскага ладу, непрыманне цывілізацыі і горада як крыніцы заганаў асобы і грамадства. Перадрамантызм – умоўная назва пераходных літаратурных з'яў (стваральнікі «гатычнага рамана» Г. Уолпал, Г. Радкліф; «Паэмы Асіяна» Дж. Макферсана паводле гэльскага фальклору Шатландыі). Жанравая характарыстыка літаратуры Асветніцтва.

Асветніцтва ў славян. Яго антыфеадальны, антыкаталіцкі характар (Польшча), насычанасць ідэямі нацыянальнага вызвалення: супраць аўстрыйскага абсалютызму (Чэхія), турэцкага прыгнёту (Сербія, Балгарыя), як процістаянне прыгону і самаўладдзю (Расія). Асветніцкая літаратура на беларускіх землях.

### *Тэма 4. Асветніцтва ў Англіі*

Англійскі раман – «классический, старинный, отменно длинный-длинный-длинный, нравоучительный и чинный» (А. Пушкін). Раман прыгод і падарожжаў. Д. Дэфо «Рабінзон Круза». Раман Дж. Свіфта «Падарожжы Гулівера». Жанр сентыментальнага рамана: Л. Стэрн «Сентыментальнае падарожжа па Францыі і Італіі». Р. Бёрнс. Аўтабіяграфічныя матывы ў лірыцы Р. Бёрнса. Паэзія як летапіс роднага краю і біяграфія Часу. Героі Бёрнса. Тэма кахання. Жанравае багацце: вершы, эпіграмы, музычна-драматычны жанр кантаты і інш.

Дэфо і Свіфт па-беларуску. Рабінзанада ў сусветнай літаратуры (у т.л. «Палескія рабінзоны» Я. Маўра). Пераклады на беларускую мову, тыпалагічныя сыходжанні.

### *Тэма 5. Асветніцтва ў Францыі*

Асветніцтва ў Францыі. Грамадска-палітычнае значэнне дзейнасці французскіх асветнікаў: Вальтэр і вальтэр'янства, Дзідро і «Энцыклапедыя», Русо і русаізм. Філасофскія аповесці Вальтэра. Уплыў вальтэр'янства на развіццё філасофскай, сацыяльна-палітычнай думкі ў Беларусі. Д. Дзідро – прадстаўнік рэалістычнага мастацтва ў драматургіі і прозе, у тэорыі асветніцкага рэалізму. Ж.Ж. Русо – прадстаўнік сентыменталізму. Першыя сацыяльна-палітычныя камедыі ў французскай літаратуры: «Севільскі цырульнік, або Марная перасцярога» і «Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігаро» П. А. К. Бамаршэ.

Пастаноўкі оперы Дж. Расіні «Севільскі цырульнік» і В.А. Моцарта «Жаніцьба Фігара» на беларускай сцэне (пераклад апошняй на беларускую мову ў 1936 г. А. Дударом). Асветніцтва ў Францыі як адна з перадумоў Вялікай французскай рэвалюцыі 1789–1794 гг., яго ўплыў на жыццё тагачаснай Еўропы (у т.л. на Беларусь).

### *Тэма 6. Асветніцтва ў Германіі*

Поспехі нямецкага Асветніцтва ў галіне філасофіі і тэорыі мастацтва. Тэарэтык і практык рэалістычнага мастацтва – Г.Э. Лесінг. Нацыянальна-культурны рух «Бура і націск» – этап асветніцкай літаратуры. Гётэ і Шылер як прадстаўнікі шцюрмерства (старонкі з біяграфіі).

Ф. Шылер. Шляхі да справядлівай грамадскай пабудовы ў творчасці нямецкага асветніка: індывідуальны бунт («Разбойнікі»), народнае паўстанне («Змова Фіеска ў Генуі»), выхаванне манарха («Дон Карлас»). Перыяд веймарскага класіцызму ў творчасці Шылера і Гётэ (канцэпцыя эстэтычнай адукацыі і выхавання; 1797 – год балад). Шылер як адзін з найбольш вядомых драматургаў свету.

І.В Гётэ. Перыядызацыя жыцця і творчасці. Гётэ – паэт-лірык (балада «Лясны цар», пераклады па-беларуску). Гётэ – празаік (раман «Пакуты маладога Вертэра»). Трагедыя «Фаўст»: з гісторыі вечнага вобраза, спецыфіка яго распрацоўкі ў творчасці Гётэ. Пошукі Фаўстам сэнсу чалавечага жыцця і ўласнага прызначэння, пошукі Ісціны. «Спакушэнні» на шляху героя. Фаўст і Мефістофель. Фаўст і Вагнер. Фаўст і Маргарыта. Фаўст і Алена Спартанская. Эвалюцыя вобраза загалоўнага героя. Канкрэтна-гістарычны змест і вечны сэнс вобраза Фаўста.

Перастварэнне вобразаў рамана «Пакуты маладога Вертэра» (В.А. Моцарт «Сімфонія № 40, Вертэраўская», У. Пленцдорф «Новыя пакуты маладога Вертэра» і інш.). Вертэраўскі тып героя. Гётэ і выяўленчае мастацтва (ілюстрацыі да твораў Гётэ, у т.л. А. Кашкурэвіча: новае прачытанне трагедыі «Фаўст» у XX ст.). Гётэ і тэатр (1860-я гады як час пачатку шырокага знаёмства з творамі нямецкага драматурга на Беларусі. Пастаноўкі XIX–XX стагоддзяў). Гётэ і музыка: опера Ш. Гуно «Фаўст», опера Ж. Маснэ «Вертэр». Гётэ па-беларуску. Афарызмы, цытаты з Гётэ. Прысвячэнні Гётэ.

### *Тэма 7. Сусветная літаратура 1-й паловы XIX стагоддзя: агульная характарыстыка. Рамантызм*

Вылучэнне гістарычных перыядаў: асноўныя літаратурна-мастацкія крытэрыі. Новы этап у развіцці сусветнага літаратурнага працэсу. Складванне асноўных літаратурных кірункаў (рамантызм, рэалізм) у еўрапейскіх літаратурах. Фарміраванне рамантызму пад уплывам сацыяльна-палітычных падзей у 2-й палове 1790-х гадоў (Германія, Англія, Францыя), 1800-я гады (Італія, Іспанія, Расія), паўсямеснае яго распаўсюджванне ў 1830–1940-я гады. Эстэтычныя передумовы, філасофскае абгрунтаванне ідэй рамантыкаў. Рамантызм як літаратурна-мастацкі кірунак.

Сінтэз мастацтваў у рэчышчы рамантычнага светаўспрымання: літаратуры і музыкі (песні Ф. Шуберта на словы В. Мюлера: цыклы «Прыгожая млынарка», «Зімні шлях»; вакальныя цыклы Р. Шумана на словы Г. Гейнэ, А. Шаміса, музыка да «Манфрэда» Дж. Г. Байрана), літаратуры і жывапісу (В. Ваньковіч «А. Міцкевіч на скале Аю-Даг», уплыў «Крымскіх санетаў» на беларускага мастака) і інш.

### *Тэма 8. Рамантызм у літаратуры Германіі*

Праграмныя працы («Фрагменты» Ф. Шлегеля). Мастацтва як вышэйшая ступень разумення свету. Самы важны яе від – музыка. Вобраз паэта ў рамане Наваліса «Генрых фон Офтэрдынген».

Паэзія нямецкага рамантызму. Вершы, прысвечаныя старажытнай Эладзе і хрысціянству (Ф. Гёльдэрлін). Паэты Гейдэльбергскай школы: К. Брэнтана і Арнім. Цыкл балад «Нямецкія народныя паданні» А. Шаміса, паэтычны цыкл «Каханне і жыццё жанчыны» (музыка Р. Шумана). Паэзія і музыка ў творчасці Ё. Айхендорфа. Жыццёвы і творчы шлях В. Мюлера: сувязь з народам, трагічнасць жыцця.

«Песнярова пракляцце» Л. Уланда і «Курган» Я. Купалы: вобразы ваяўнічых тыранаў-уладароў, мужных і праўдзівых песняроў, тэматыка песень вандроўных спевакоў, аўтарскае слова ў творах. «Катрыншчык» Мюлера на музыку Шуберта і беларускі пераклад. Кніга перакладаў нямецкіх паэтаў-рамантыкаў па-беларуску – «Закаханы вандроўнік» (Мінск, 1989): тыпалагічная блізкасць нямецкай паэзіі матывам і вобразам беларускай лірыкі.

Проза нямецкага рамантызму: браты Грым, Генрых фон Клейст (у т.л. драматургія апошняга). Уплыў музыкі і жывапісу на творчасць Э.Т.А. Гофмана: казкі і лібрэта («Шчаўкунок» як аснова для «Казак Гофмана» французскага кампазітара Ж. Офенбаха). Фантастычнае і рэальнае ў свеце Гофмана. Пераклады Гофмана па-беларуску, пастаноўкі на беларускай сцэне.

***Тэма 9. Рамантызм у літаратуры Англіі*** Нацыянальныя асаблівасці рамантызму. Росквіт паэзіі і асновы рамантычнай літаратуры ў паэзіі «Азёрнай школы». Проза: В. Скот – стваральнік жанру гістарычнага рамана.

Дж. Г. Байран. Жыццёвы і творчы шлях. «Усходнія» паэмы («Карсар», «Гяур»). Паэма «Шыльёнскі вязень». Вечныя вобразы ў творах (Праметэй, Дон Жуан). Вобразы тытанаў сусветнай культуры («Прароцтва Дантэ»). Матывы адчаю і адзіноты («Стансы да Аўгусты» – «Калі згасіў праменне змрок...»), пачуцці асуджанасці і працяг жыцця («Змрок на душы маёй...»), філасофскі роздум над сутнасцю існавання – спалучэнне гэтых тэм і матываў у «Паломніцтве Чайльда Гарольда».

Байранізм як спецыфічны кірунак еўрапейскай рамантычнай думкі. Сацыяльна-рэвалюцыйныя, нацыянальна-вызваленчыя матывы ў творчасці Дж. Байрана і Я. Купалы. Уплыў байранізму на беларускую паэзію. Прысвячэнні Байрану: Я. Лучына, У. Караткевіч.

***Тэма 10. Рамантызм у літаратуры Францыі***

Проза: узнікненне жанру рамана-споведзі (аповесці «Атала», «Рэне» Ф.Р. Шатабрыяна, «Адольф» Б. Канстана, «Споведзь сына стагоддзя» А. дэ Мюсэ), спецыфіка гістарычнага рамана («Сен-Мар» А. дэ Віні, раманы А. Дюма), жанр сацыяльнага рамана (Жорж Санд).

В. Гюго. Прадмовы да драмы «Кромвель» як літаратурны маніфест французскага рамантызму. Жанр гістарычнага рамана ў творчасці В. Гюго. Раман «Сабор Парыжскай Божай Мацеры»: зварот да гістарычнага мінулага, нацыянальнай гісторыі. Вобраз Сабора – раманскае і гатычнае, «мясцовы каларыт», сімволіка вобразаў, Сабор як галоўны герой рамана. Супастаўленні і

проціпастаўленні дзеючых асоб, выключнасць характараў і выключнасць абставін. Сінтэз мастацтваў. Паэзія Гюго: успаміны, роздум, адлюстраванне падзей жыцця («Сейбіт», «Захад сонца», «На барыкадзе»).

### *Тэма 11. Рамантызм у літаратуры ЗША*

Проза: распрацоўка жанру рамана (гістарычнага, прыгодніцкага, марскога, бытавога) ў творчасці Ф. Купера. Пачынальнік жанру дэтэктыўнай прозы Э. По, майстэрства навелы: атмасфера жахлівага, праніклівасць героя і інш. Паэзія: Э. По – тэма адчаю і смутку ў вершах, «страшнае» ў «натуральным», паводле В. Брусава (паэма «Крумкач»), памяць пра жонку, якую страціў (паэма «Анабель Лі»). Услаўленне патрыярхальнага мінулага ў творчасці Г. Лангфэла – «Спеў аб Гаяваце» – «індзейская Эда», гістарычнае і міфалагічнае ў паэме. Рамантычная туга па казачнаму мінуламу. Нацыянальныя асаблівасці рамантызму ў літаратуры ЗША.

### *Тэма 12. Сусветная літаратура XIX стагоддзя: агульная характарыстыка. Рэалізм*

Літаратура рэалізму ў XIX ст.: тыпалогія літаратурнага кірунку. Паняцце «крытычны рэалізм». Філасофія пазітывізму як адна з асноў зараджэння і развіцця рэалістычнай літаратуры. Асноўная формула, спасціжэнне законаў фарміравання асобы пад уплывам асяроддзя. Сувязі з філасофіяй, прыродазнаўчымі навукамі. Асноўныя прынцыпы (праўдзівасць, гістарызм, псіхалагізм, навуковае вывучэнне і інш.). Мара пра ідэал (у сацыяльных нізах), крушэнне ілюзій (у т.л. на разумовую пабудову грамадства). Асноўны канфлікт. Сінтэз традыцый. Роля мастацкай дэталі (падрабязнасцей быту, пейзажа, партрэта, жэста, суб'ектыўных рэакцый, мовы, інтэр'ера).

### *Тэма 13. Рэалізм у літаратуры Францыі*

Паэзія: П. Ж. Беранжэ.

Проза – Ф. Стэндаль. Вывучэнне «італьянскага характару» ў кантэксце тагачасных палітычных падзей (навела «Ваніна Ваніні»). Працяг пошукаў чалавекам моцных пачуццяў. Тэма страчаных ілюзій у святле рэалістычнага вывучэння рэчаіснасці: раман «Чырвонае і чорнае» як «хроніка XIX стагоддзя».

П. Мерымэ – гістарычныя сюжэты, майстэрства рэалістычнага апавядання ў творах (навела «Кармэн» як аснова оперы французскага кампазітара Ж. Бізэ «Кармэн»).

А. дэ Бальзак. Гісторыя Францыі перыяду Рэстаўрацыі і ліпеньскай манархіі ў творах А. дэ Бальзака. Філасофскі раман «Шчыгрынавая скура». Задума і план «Чалавечай камедыі», асаблівасці яе ажыццяўлення. Вечны вобраз скупога. «Габсэк» Бальзака: спалучэнне рэалістычнага і рамантычнага, высокага і нізкага, гіпербалізацыі і індывідуалізацыі вобраза. Майстэрства Бальзака-псіхолага, мастака (рэмбрантаўскі партрэт), роля колеру і гуку ў структуры мастацкага вобраза.

Г. Флабер. Эстэтычныя погляды, літаратурная спадчына пісьменніка. Складанасць вобраза спадарыні Бавары ў аднайменным рамане. Асаблівасці

гістарычнага рамана ў творчасці Флабера («Саламбо»). Тэма страчаных ілюзій і яе вырашэнне ў іншым гістарычным кантэксце (раман «Выхаванне пачуццяў»). Выкрыццё заганаў буржуазнага грамадства. Майстэрства мастацкага слова Флабера.

### *Тэма 14. Рэалізм у літаратуры Англіі*

Віктарыянства як перыяд і лад жыцця, ідэалогія і духоўная атмасфера. Прадстаўнікі т.зв. «бліскучай плеяды»: Ч. Дзікенс, У. Тэкерэй, сёстры Брантэ. Адлюстраванне заганаў віктарыянскай Англіі ў раманах Ч. Дзікенса. Цяжкасці жыццёвых выпрабаванняў, што выпалі на долю героя, перамога дабра і пакаранне зла ў рамане «Прыгоды Алівера Твіста». Іншыя «выхаваўчыя» раманы пісьменніка. Асаблівасці меладраматызму ў творчасці Дзікенса, тыпалагічныя паралелі з яго элементамі ў беларускай літаратуры (вастрыня інтрыгі і перабольшванне эмацыянальнасці, рэзкае супрацьстаянне дабра і зла і маралізатарскія тэндэнцыі і інш.). «Ярмарка пыхлівасці» У. Тэкерэя: сацыяльна-палітычныя, маральныя праблемы, іронія і сатыра ў творы, праблема «рамана без героя». Раман Ш. Брантэ «Джэн Эйр».

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА XVII–XIX СТАГОДДЗЯЎ»**
**дзённая форма атрымання адукацыі**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, пытанні па тэме | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная (пазааўдыторная) работа | Метадычныя дапаможнікі, сродкі навучання | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| | **СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА XVII-XIX стагоддзяў** | **28** | **28** | **52** | | | |
| **1.** | ***XVII стагоддзе і літаратурны працэс. Барока*** | **2** | | **2** | | | |
| | 1. Крызіс гуманізму. Літаратурная барацьба.<br>2. Фарміраванне асноўных літаратурных кірункаў. Барока як мастацка-эстэтычная сістэма.<br>3. Барока ў Іспаніі: П. Кальдэрон, яго рэлігійна-філасофскія (гісторыка-філасофскія) драмы.<br>4. Барока ў Германіі: паэзія.<br>5. Раман Грымельсгаўзена «Сімпліцысімус»: дваістасць чалавека і свету.<br>6. Барока ў славян і беларусаў. Буйнейшы прадстаўнік – Сімяон Полацкі. «Высокае» і «нізкае» барока.<br>7. | 2 | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | Асн. [1] Дад. [4] [5] [6] | Выступленне з паведамленнямі. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.** | ***Класіцызм*** | **2** | **4** | **4** | | | |
| | 1. Філасофская аснова – картэзіянства. Гістарычныя этапы ў развіцці класіцызму ў Францыі. Тэорыя класіцызму Н. Буало.<br>2. Оды Ф. Малерба, байкі Ж. Лафантэна.<br>3. Маральная праблематыка ў прозе французскіх класіцыстаў. «Сід» Карнэля як узор літаратуры класіцызму 1-га перыяду.<br>4. «Андрамаха» Расіна – новая канцэпцыя ў класіцызме 2-га перыяду.<br>5. Мальер: асноўныя этапы жыцця і творчасці. Камедыі «Скупы», «Тарцюф», «Мешчанін у дваранах», «Дон Жуан» і іншыя: традыцыйнае і наватарскае.<br>6. Літаратура Англіі. Традыцыі барока і класіцызму. Дж. Мільтан. | 2 | 4 | 4 | Мультымедый ная прэзентацыя. Мастацкія тэксты | Асн. [1] Дад. [4] [5] [6] | Вуснае апытванне |
| **3.** | ***XVIII стагоддзе: Асветніцтва*** | **2** | | **2** | | | |
| | 1. XVIII стагоддзе і яго месца ў гісторыі сусветнай літаратуры. Асветніцтва як комплекс ідэй у культурным руху Еўропы.<br>2. Асноўныя літаратурныя кірункі. Водгукі барока ў камедыях плашча і шпагі К. Гоцы, жанр тэатральнай казкі – ф’ябы.<br>3. Мастацтва ракако (паэзія кахання Э. Парні, элементы ў «Арлеанскай нявінніцы» Вальтэра).<br>4. Асветніцкі класіцызм: роля грамадства, ідэя выхавання чалавека.<br>5. Асветніцкі рэалізм.<br>6. Сентыменталізм як напрамак Сталага Асветніцтва.<br>7. Перадрамантызм – умоўная назва пераходных літаратурных з’яў.<br>8. Жанравая характарыстыка літаратуры Асветніцтва.<br>9. Асветніцтва ў славян. | 2 | | 2 | Мастацкія тэксты | Асн. [1] Дад. [4] [5] [6] | Выступленне з паведамленнямі. |
| **4.** | ***Асветніцтва ў Англіі*** | **2** | **2** | **2** | | | |
| | 1. Англійскі раман.<br>2. Раман прыгод і падарожжаў. Д. Дэфо «Рабінзон Круза». Раман Дж. Свіфта «Падарожжы Гулівера».<br>3. Жанр сентыментальнага рамана: Л. Стэрн «Сентыментальнае падарожжа па Францыі і Італіі». | 2 | 2 | 2 | Мастацкія тэксты. Мультымедый ная прэзентацыя. | Асн. [1] Дад. [4] [5] | Выступленне з паведамленнямі. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 4. Р. Бёрнс. Аўтабіяграфічныя матывы ў лірыцы Р. Бёрнса. Жанравае багацце: вершы, эпіграмы, музычна-драматычны жанр кантаты і інш.<br>5. Дэфо і Свіфт па-беларуску. Рабінзанада ў сусветнай літаратуры (у т.л. «Палескія рабінзоны» Я. Маўра). | | | | | [6] | |
| **5.** | ***Асветніцтва ў Францыі*** | **2** | **2** | **4** | | | |
| | 1. Асветніцтва ў Францыі. Грамадска-палітычнае значэнне дзейнасці французскіх асветнікаў: Вальтэр і вальтэр'янства, Дзідро і «Энцыклапедыя», Русо і русаізм.<br>2. Філасофскія аповесці Вальтэра. Уплыў вальтэр'янства на развіццё філасофскай, сацыяльна-палітычнай думкі ў Беларусі.<br>3. Д. Дзідро – прадстаўнік рэалістычнага мастацтва ў драматургіі і прозе, у тэорыі асветніцкага рэалізму.<br>4. Ж.Ж.Русо – прадстаўнік сентыменталізму.<br>5. Першыя сацыяльна-палітычныя камедыі ў французскай літаратуры: «Севільскі цырульнік, або Марная перасцярога» і «Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігаро» П.А.К. Бамаршэ.<br>6. Асветніцтва ў Францыі як адна з перадумоў Вялікай французскай рэвалюцыі 1789 – 1794 гг., яго ўплыў на жыццё тагачаснай Еўропы (у т.л. на Беларусь). | 2 | 2 | 4 | Ілюстрацыйны матэрыял | Асн. [1]<br>Дад. [4]<br>[5]<br>[6] | Вуснае апытванне |
| **6.** | ***Асветніцтва ў Германіі*** | **2** | **2** | **4** | | | |
| | 1. Поспехі нямецкага Асветніцтва ў галіне філасофіі і тэорыі мастацтва. Тэарэтык і практык рэалістычнага мастацтва – Г.Э.Лесінг.<br>2. Ф. Шылер. Шляхі да справядлівай грамадскай пабудовы ў творчасці нямецкага асветніка: індывідуальны бунт («Разбойнікі»), народнае паўстанне («Змова Фіеска ў Генуі»), выхаванне манарха («Дон Карлас»).<br>3. І.В. Гётэ. Перыядызацыя жыцця і творчасці. Гётэ – паэт-лірык. Гётэ – празаік. Трагедыя «Фаўст». | 2 | 2 | 4 | Мастацкія тэксты. Мультымедыйная прэзентацыя. | Асн. [1]<br>Дад. [4]<br>[5]<br>[6] | Вуснае апытванне |
| **7.** | ***Сусветная літаратура 1-й паловы XIX стагоддзя: агульная характарыстыка. Рамантызм*** | **2** | | **4** | | | |
| | 1. Вылучэнне гістарычных перыядаў: асноўныя літаратурна-мастацкія крытэрыі. Новы этап у развіцці сусветнага | 2 | | 4 | Мультымедыйная | Асн. [1] | Выступленне з паведамленнямі. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | літаратурнага працэсу.<br>2. Складванне асноўных літаратурных кірункаў (рамантызм, рэалізм) у еўрапейскіх літаратурах.<br>3. Эстэтычныя перадумовы, філасофскае абгрунтаванне ідэй рамантыкаў. Рамантызм як літаратурна-мастацкі кірунак.<br>4. Сінтэз мастацтваў у рэчышчы рамантычнага светаўспрымання: літаратуры і музыкі | | | | прэзентацыя.<br>Мастацкія тэксты | Дад.<br>[4]<br>[5]<br>[6]<br>[7] | |
| **8.** | ***Рамантызм у літаратуры Германіі*** | **2** | **4** | **4** | | | |
| | 1. Праграмныя працы («Фрагменты» Ф. Шлегеля). Вобраз паэта ў рамане Навaліса «Генрых фон Офтэрдынген».<br>2. Паэзія нямецкага рамантызму. Вершы, прысвечаныя старажытнай Эладзе і хрысціянству (Ф. Гёльдэрлін).<br>3. Паэты Гейдэльбергскай школы: К. Брэнтана і Арнім. Цыкл балад «Нямецкія народныя паданні» А. Шаміса, паэтычны цыкл «Каханне і жыццё жанчыны» (музыка Р. Шумана).<br>4. Паэзія і музыка ў творчасці Ё. Айхендорфа. Жыццёвы і творчы шлях В. Мюлера: сувязь з народам, трагічнасць жыцця.<br>5. «Песнярова пракляцце» Л. Уланда і «Курган» Я. Купалы.<br>6. Проза нямецкага рамантызму: браты Грым, Генрых фон Клейст (у т.л. драматургія апошняга).<br>7. Творчасць Э.Т.А. Гофмана. | 2 | 4 | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя. | Асн.<br>[1]<br>Дад.<br>[4]<br>[5]<br>[6]<br>[7] | Экспрэс-апытанне |
| **9.** | ***Рамантызм у літаратуры Англіі*** | **2** | **2** | **4** | | | |
| | 1. Нацыянальныя асаблівасці рамантызму.<br>2. Росквіт паэзіі і асновы рамантычнай літаратуры ў паэзіі «Азёрнай школы».<br>3. Проза: В. Скот – стваральнік жанру гістарычнага рамана.<br>4. Дж. Г. Байран. Жыццёвы і творчы шлях. «Усходнія» паэмы («Карсар», «Гяур»). Паэма «Шыльёнскі вязень».<br>5. Байранізм як спецыфічны кірунак еўрапейскай рамантычнай думкі. | 2 | 2 | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя.<br>Мастацкія тэксты | Асн.<br>[1]<br>Дад.<br>[4]<br>[5]<br>[6]<br>[7] | Вусная праверка |
| **10.** | ***Рамантызм у літаратуры Францыі*** | **2** | **2** | **4** | | | |
| | 1. Проза: узнікненне жанру рамана-споведзі (аповесці «Атала», «Рэнэ» Ф.Р. Шатабрыяна, «Адольф» Б. Канстана, «Споведзь сына стагоддзя» А. дэ Мюсэ), спецыфіка гістарычнага рамана («Сен- | 2 | 2 | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя. | Асн.<br>[1]<br>Дад. | Вуснае апытванне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Мар» А. дэ Віньі, раманы А. Дюма), жанр сацыяльнага рамана (Жорж Санд).<br>2. В. Гюго. Прадмовы да драмы «Кромвель» як літаратурны маніфест французскага рамантызму. Жанр гістарычнага рамана ў творчасці В. Гюго.<br>3. Раман «Сабор Парыжскай Божай Мацеры»: зварот да гістарычнага мінулага, нацыянальнай гісторыі.<br>4. Паэзія Гюго: успаміны, роздум, адлюстраванне падзей жыцця («Сейбіт», «Захад сонца», «На барыкадзе»). | | | | Мастацкія тэксты | [4]<br>[5]<br>[6]<br>[8] | |
| **11.** | ***Рамантызм у літаратуры ЗША*** | **2** | **2** | **4** | | | |
| | 1. Проза: распрацоўка жанру рамана (гістарычнага, прыгодніцкага, марскога, бытавога) ў творчасці Ф. Купера.<br>2. Пачынальнік жанру дэтэктыўнай прозы Э. По. Паэзія: Э. По – тэма адчаю і смутку ў вершах, «страшнае» ў «натуральным».<br>3. Услаўленне патрыярхальнага мінулага ў творчасці Г. Лангфэла – «Спеў аб Гаяваце» – «індзейская Эда», гістарычнае і міфалагічнае ў паэме. | 2 | 2 | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя | Асн.<br>[1]<br>Дад.<br>[4]<br>[6]<br>[9] | Выступленне з паведамленнямі. |
| **12.** | ***Сусветная літаратура XIX стагоддзя: агульная характарыстыка. Рэалізм*** | **2** | | **2** | | | |
| | 1. Літаратура рэалізму ў XIX ст.: тыпалогія літаратурнага кірунку.<br>2. Паняцце «крытычны рэалізм». Філасофія пазітывізму як адна з асноў зараджэння і развіцця рэалістычнай літаратуры.<br>3. Сувязі з філасофіяй, прыродазнаўчымі навукамі. | 2 | | 2 | Мастацкія тэксты | Асн.<br>[2]<br>[3]<br>Дад.<br>[4]<br>[7] | Вусная праверка |
| **13.** | ***Рэалізм у літаратуры Францыі*** | **2** | **4** | **6** | | | |
| | 1. Паэзія: П.Ж. Беранжэ.<br>2. Проза – Ф. Стэндаль.<br>3. П. Мерымэ – гістарычныя сюжэты, майстэрства рэалістычнага апавядання ў творах.<br>4. А. дэ Бальзак.<br>5. Г. Флабер. | 2 | 4 | 6 | Мультымедыйная прэзентацыя.<br>Мастацкія тэксты | Асн.<br>[2]<br>[3]<br>Дад.<br>[4]<br>[5]<br>[8] | Аналіз і прагляд твораў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **14.** | ***Рэалізм у літаратуры Англіі*** | **2** | **4** | **6** | | | |
| | 1. Віктарыянства як перыяд і лад жыцця, ідэалогія і духоўная атмасфера.<br>2. Прадстаўнікі «бліскучай плеяды»: Ч. Дзікенс, У. Тэкерэй, сёстры Брантэ.<br>3. Адлюстраванне заганаў віктарыянскай Англіі ў раманах Ч. Дзікенса.<br>4. «Ярмарка пыхлівасці» У. Тэкерэя: сацыяльна-палітычныя, маральныя праблемы, іронія і сатыра ў творы, праблема «рамана без героя».<br>5. Раман Ш. Брантэ «Джэн Эйр». | 2 | 4 | 6 | Мультымедыйная прэзентацыя.<br>Мастацкія тэксты | Асн.<br>[2]<br>[3]<br>Дад.<br>[4]<br>[5]<br>[6]<br>[9] | Выступленне з паведамленнямі. |
| | **УСЯГО** | **28** | **28** | **52** | | | **Залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА


**Асноўная літаратура**

1. Гранкина, Е. В. История зарубежной литературы XVII–XVIII веков [Электронный ресурс] : интерактив. электрон. учеб.-метод. комплекс / Е. В. Гранкина, Н. А. Развадовская // СДО Moodle / Белорус. гос. пед. ун-т. – Режим доступа: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=4319. – Дата доступа: 14.05.2022.
2. История зарубежной литературы (история зарубежной литературы XIX века) [Электронный ресурс] : электрон. учеб.-метод. комплекс для специальностей 1-02 03 02 «Русский язык и литература», 1-02 03 04 «Русский язык и литература. Иностранный язык (с указанием языка)» / сост. Т. Е. Комаровская // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/2136. – Дата доступа: 13.06.2022.
3. Развадовская, Н. А. Зарубежная литература XIX века [Электронный ресурс] : учеб.-метод. пособие / Н. А. Развадовская // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/1443. – Дата доступа: 13.06.2022.

**Дадатковая літаратура**

4. Адамовіч, Г. Я. Літаратурная класіка ў параўнальным вывучэнні / Г. Я. Адамовіч. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2008. – 112 с.
5. Гранкина, Е. В. История зарубежной литературы XVII–XVIII веков: комплекс тестовых заданий : практикум для студентов учреждений высш. образования / Е. В. Гранкина, Н. А. Развадовская. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2016. – 148 с.
6. История зарубежной литературы XIX века : учебник / Е. М. Апенко [и др.] ; под ред. Е. М. Апенко. – М. : Проспект, 2001. – 413 с.
7. Луков, В. А. История литературы. Зарубежная литература от истоков до наших дней : учеб. пособие для студентов пед. вузов / В. А. Луков. – М. : Академия, 2003. – 511 с.
8. Проскурин, Б. М. История зарубежной литературы XIX века. Западноевропейская реалистическая проза : учеб. пособие / Б. М. Проскурин, Р. Ф. Яшенькина. – М. : Флинта : Наука, 2006. – 416 с.
9. Тарасова, Е. В. Традиции готического романа в прозе США XIX – первой трети XX веков (Э. А. По, А. Бирс, Г. Ф. Лавкрафт) : монография / Е. В. Тарасова. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2022. – 126 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ (ПАЗААЎДЫТОРНАЙ) РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА XVII–XIX СТАГОДДЗЯЎ»

Самастойная работа студэнтаў з’яўляецца адным з найважнейшых і найбольш эфектыўных элементаў навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Гэта сумесная дзейнасць выкладчыка і студэнта, накіраваная на самастойнае авалоданне студэнтам часткай дысцыпліны пры дапамозе спецыяльна распрацаванага навукова-метадычнага забеспячэння, якая прадугледжвае арганізацыю дадатковых кансультацый і спецыяльных відаў кантролю з боку выкладчыка, акрамя прадугледжаных вучэбным планам форм прамежкавага і выніковага кантролю кампетэнцый студэнтаў па дысцыпліне.

Мэта самастойнай работы студэнтаў: развіццё ўнутраных псіхалагічных механізмаў інтэлектуальнай актыўнасці студэнтаў, іх пазнавальных здольнасцей шляхам уключэння ў ініцыятыўную вучэбную і навукова-прафесійную дзейнасць, павышэнне канкурэнтаздольнасці выпускнікоў ВНУ праз фарміраванне ў іх кампетэнцый самаадукацыі.

Віды самастойнай працы студэнтаў:

а) рэпрадуктыўная (вучэбная, кансультацыйная), якая ўключае выкананне заданняў з вучэбнай літаратуры.

б) прадуктыўная (даследчая), якая ўключае выкананне навукова-даследчай работы; вывучэнне, анатаванне, рэферыраванне дадатковай вучэбнай літаратуры; падрыхтоўку да канферэнцый і г.д.

Формы самастойнай работы студэнтаў: падрыхтоўка да лекцый і практычных заняткаў; вывучэнне вучэбных дапаможнікаў; вывучэнне тэм і праблем, якія не выносяцца на лекцыі і практычныя заняткі; падрыхтоўка рэфератаў, паведамленняў і дакладаў; складанне бібліяграфіі і рэферыраванне па самастойна вывучанай тэме.

Кантроль самастойнай работы можа ажыццяўляцца ў выглядзе тэстаў, абмеркавання рэфератаў, абмеркавання і абароны вучэбных заданняў, экспрэс-апытанняў на аўдыторных занятках, калёквіумаў.

**Прыкладны пералік і кароткая характарыстыка ацэначных сродкаў**

| № п/п | Найменне АС | Кароткая характарыстыка АС | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| 1. | Рэферат | Прадукт самастойнай работы студэнта – кароткі выклад у пісьмовай форме атрыманых вынікаў тэарэтычнага аналізу пэўнай тэмы, у якім аўтар перадае змест матэрыялу, прыводзіць розныя пункты гледжання, а таксама ўласны погляд на яе | Тэматыка рэфератаў |
| 2. | Паведамленне | Сродак, які спрыяе ацэнцы ўмення студэнта пісьмова выкладаць сутнасць вызначанай праблемы, рабіць высновы, | Тэматыка паведамленняў |

| № п/п | Найменне АС | Кароткая характарыстыка АС | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| | | якія абагульняюць аўтарскую пазіцыю па пэўнай праблеме | |
| 3. | Даклад | Прадукт самастойнай работы студэнта, публічнае выступленне з прэзентацыяй атрыманых вынікаў аналізу пэўнай тэмы ці праблемы | Тэматыка дакладаў |
| 4. | Канспект | Прадукт самастойнай работы студэнта – поўны выклад у пісьмовай форме атрыманых вынікаў тэарэтычнага аналізу пэўнай тэмы, у якім аўтар перадае змест матэрыялу | Спіс літаратуры для канспектавання |
| 5. | Бібліяграфічны спіс | Прадукт самастойнай работы студэнта, які ўяўляе сабой спіс літаратуры па пэўнай тэме ці праблеме, неабходнай для яе вывучэння | Пералік тэм для складання бібліяграфічнага спіса |

# ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ (дзённая форма атрымання адукацыі)

| | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Раздзел 1. XVII стагоддзе і літаратурны працэс. Барока | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць паведамленні па тэмах:<br>1. Пераклады на беларускую мову. Барока ў славян і беларусаў.<br>2. Буйнейшы прадстаўнік – Сімяон Полацкі. «Высокае» і «нізкае» барока. | Падрыхтоўка паведамленняў паводле кантрольных пытанняў |
| 2. | Раздзел 2. Класіцызм | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць рэфераты па тэмах:<br>1. Маральная праблематыка ў прозе французскіх класіцыстаў: М. Лафайет («Прынцэса Клеўская»), Б. Паскаль («Думкі»),<br>2. Ф. Ларашфуко («Максімы»), Ж. Лабруер («Характары, або Норавы нашага стагоддзя»).<br>3.Жанры трагедыі (П. Карнель, Ж. Расін) | Падрыхтоўка рэфератаў паводле кантрольных пытанняў |
| 3. | Раздзел 3. XVIII стагоддзе: Асветніцтва | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць паведамленні па тэмах:<br>1. Асветніцтва ў славян. Яго антыфеадальны, антыкаталіцкі характар (Польшча), насычанасць ідэямі нацыянальнага вызвалення: супраць аўстрыйскага абсалютызму (Чэхія), турэцкага прыгнёту (Сербія, Балгарыя), як процістаянне прыгону і самаўладдзю (Расія).<br>2. Асветніцкая літаратура на беларускіх землях. | Падрыхтоўка паведамленняў паводле кантрольных пытанняў. Састаўленне бібліяграфіі і рэферыраванне самастойна вывучанай тэмы |
| 4. | Раздзел 4. Асветніцтва ў Англіі | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць паведамленні па тэмах:<br>1. Дэфо і Свіфт па-беларуску. Рабінзанада ў сусветнай літаратуры (у т.л. «Палескія рабінзоны» Я.Маўра).<br>2. Пераклады на беларускую мову, тыпалагічныя сыходжанні. | Падрыхтоўка паведамленняў паводле кантрольных пытанняў |
| 5. | Раздзел 5. Асветніцтва ў Францыі | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць адказы па тэмах:<br>1. Пастаноўкі оперы Дж. Расіні «Севільскі цырульнік» і В.А. Моцарта «Жаніцьба Фігара» на беларускай сцэне (пераклад апошняй на беларускую мову ў 1936 г. А. Дударом).<br>2. Асветніцтва ў Францыі як адна з перадумоў Вялікай французскай | Падрыхтоўка паведамленняў паводле кантрольных пытанняў. Састаўленне |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | рэвалюцыі 1789 – 1794 гг., яго ўплыў на жыццё тагачаснай Еўропы (у т.л. на Беларусь). | бібліяграфіі і рэферыраванне самастойна вывучанай тэмы |
| 6. | Раздзел 6. Асветніцтва ў Германіі | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць рэфераты па тэмах:<br>1. Вертэраўскі тып героя. Гётэ і выяўленчае мастацтва (ілюстрацыі да твораў Гётэ, у т.л. А. Кашкурэвіча: новае прачытанне трагедыі «Фаўст» у XX ст.).<br>2. Гётэ і тэатр (1860-я гады як час пачатку шырокага знаёмства з творамі нямецкага драматурга на Беларусі. Пастаноўкі XIX – XX стагоддзяў). Гётэ і музыка: опера Ш. Гуно «Фаўст», опера Ж. Маснэ «Вертэр». Гётэ па-беларуску.<br>3. Афарызмы, цытаты з Гётэ. Прысвячэнні Гётэ. | Падрыхтоўка рэфератаў паводле кантрольных пытанняў |
| 7. | Раздзел 7. Сусветная літаратура 1-й паловы XIX ст.: агульная характарыстыка. Рамантызм | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць паведамленні па тэмах:<br>1. Сінтэз мастацтваў у рэчышчы рамантычнага светаўспрымання: літаратуры і музыкі (песні Ф. Шуберта на словы В. Мюлера: цыклы «Прыгожая млынарка», «Зімні шлях»; вакальныя цыклы Р. Шумана на словы Г. Гейнэ, А. Шаміса, музыка да «Манфрэда» Дж.Г. Байрана);<br>2. літаратуры і жывапісу (В. Ваньковіч «А. Міцкевіч на скале Аю-Даг», уплыў «Крымскіх санетаў» на беларускага мастака) і інш. | Падрыхтоўка паведамленняў паводле кантрольных пытанняў |
| 8. | Раздзел 8. Рамантызм у літаратуры Германіі | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць паведамленні па тэмах:<br>1. Уплыў музыкі і жывапісу на творчасць Э.Т.А. Гофмана: казкі і лібрэта («Шчаўкунок» як аснова для «Казак Гофмана» французскага кампазітара Ж. Афенбаха).<br>2. Фантастычнае і рэальнае ў свеце Гофмана. 3. Пераклады Гофмана па-беларуску, пастаноўкі на беларускай сцэне. | Падрыхтоўка паведамленняў паводле кантрольных пытанняў |
| 9. | Раздзел 9. Рамантызм у літаратуры Англіі | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць рэфераты па тэмах:<br>1. Сацыяльна-рэвалюцыйныя, нацыянальна-вызваленчыя матывы ў творчасці Дж. Байрана і Я. Купалы.<br>2. Уплыў байранізму на беларускую паэзію.<br>3. Прысвячэнні Байрану: Я. Лучына, У. Караткевіч. | Падрыхтоўка рэфератаў паводле кантрольных пытанняў |
| 10. | Раздзел 10. Рамантызм у літаратуры Францыі | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць паведамленні па тэме:<br>1. Сінтэз мастацтваў. Паэзія Гюго: успаміны, роздум, адлюстраванне падзей жыцця («Сейбіт», «Захад сонца», «На барыкадзе»). | Падрыхтоўка паведамленняў паводле пытання |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 11. | Раздзел 11. Рамантызм у літаратуры ЗША | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць паведамленні па тэмах:<br>1. Услаўленне патрыярхальнага мінулага ў творчасці Г. Лангфэла – «Спеў аб Гаяваце» – «індзейская Эда», гістарычнае і міфалагічнае ў паэме. Рамантычная туга па казачнаму мінуламу.<br>2. Нацыянальныя асаблівасці рамантызму ў літаратуры ЗША. | Падрыхтоўка паведамленняў паводле кантрольных пытанняў |
| 12. | Раздзел 12. Сусветная літаратура XIX ст.: агульная характарыстыка. Рэалізм | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць паведамленне па тэме:<br>1. Роля мастацкай дэталі (падрабязнасцей быту, пейзажа, партрэта, жэста, суб'ектыўных рэакцый, мовы, інтэр'ера) у рэалізме. | Падрыхтоўка паведамленняў паводле пытання Састаўленне бібліяграфіі і рэферыраванне самастойна вывучанай тэмы |
| 13. | Раздзел 13. Рэалізм у літаратуры Францыі | 6 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць рэфераты па тэмах:<br>1. Асаблівасці гістарычнага рамана ў творчасці Флабера («Саламбо»).<br>2. Тэма страчаных ілюзій і яе вырашэнне ў іншым гістарычным кантэксце (раман «Выхаванне пачуццяў»). Выкрыццё заганаў буржуазнага грамадства.<br>3. Майстэрства мастацкага слова Флабера. | Падрыхтоўка рэфератаў паводле кантрольных пытанняў |
| 14. | Раздзел 14. Рэалізм у літаратуры Англіі | 6 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць паведамленні па тэмах:<br>1. Віктарыянства як перыяд і лад жыцця, ідэалогія і духоўная атмасфера.<br>2. Прадстаўнікі т.зв. «бліскучай плеяды»: Ч. Дзікенс, У. Тэкерэй, сёстры Брантэ. | Падрыхтоўка паведамленняў паводле кантрольных пытанняў |
| | **УСЯГО** | **52** | | |

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для бягучага кантролю якасці засваення ведаў студэнтамі выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

– індывідуальная гутарка са студэнтамі для выяўлення якасці ведаў матэрыялу;

– франтальнае апытванне;

– вусная праверка атрыманых ведаў;

– праверка наяўнасці заканспектаванай і рэферыраванай вучэбнай літаратуры;

– праверка выкананых даследчых заданняў;

– ацэнка ўзроўню абароны падрыхтаваных рэфератаў, паведамленняў і дакладаў;

– даследаванне ўзроўню і вызначэнне якасці аналітычнай апрацоўкі тэксту праз вусныя ці пісьмовыя выступленні студэнтаў;

– праверка выкананых практычных заданняў.

Ацэнка за выкананне заданняў, рэфератаў, дакладаў уключае: правільнасць выканання задання; адпаведнасць і паўната раскрыцця тэмы; якасць выканання работы; самастойнасць меркаванняў; логіка падачы інфармацыі; афармленне.

**Прыкладныя крытэрыі і паказчыкі ацэнкі выканання студэнтамі работ, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе бягучай атэстацыі і СР**

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| **Рэферат / паведамленне /даклад** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | тэма раскрыта поўнасцю;<br>– – тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| Аб'ём выкарыстанай навуковай літаратуры | – аб'ём навуковай літаратуры дастатковы;<br>– аб'ём навуковай літаратуры недастатковы (не больш за 2 заўвагі) |
| Сапраўднасць інфармацыі (дакладнасць, абгрунтаванасць, наяўнасць спасылак на крыніцы інфармацыі) | – інфармацыя дакладная, абгрунтаваная, утрымлівае спасылкі на выкарыстаныя крыніцы інфармацыі;<br>– інфармацыя мае заўвагі па адным пункце з трох |

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| Неабходнасць і дастатковасць інфармацыі | – прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў;<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| **Канспект** | |
| Адпаведнасць канспекта плану зместу крыніцы | – канспект адпавядае плану зместу;<br>– канспект часткова адпавядае плану зместу (не больш за 2 заўвагі) |
| Адлюстраванне ў канспекце асноўных палажэнняў крыніцы і наяўнасць вывадаў | – асноўныя палажэнні адлюстраваны, вывады прадстаўленыя;<br>– асноўныя палажэнні адлюстраваны, вывады не прадстаўленыя |
| Выразнасць, лаканічнасць выкладу | – выклад выразны і лаканічны;<br>– выклад мае заўвагі па адным пункце з двух |
| **Бібліяграфічны спіс** | |
| Дакладнасць інфармацыі | – інфармацыя дакладная;<br>– інфармацыя мае заўвагі (не больш за 2) |
| Сапраўднасць інфармацыі | – інфармацыя сапраўдная;<br>– інфармацыя мае заўвагі (не больш за 2) |
| | |

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПАВЕДАМЛЕННЯЎ, РЭФЕРАТАЎ, ДАКЛАДАЎ

1. Драматургічная рэформа Ж.-Б. Мальера. Лёс камедыі «Тарцюф». Вобраз галоўнага героя Тарцюфа.
2. Сатырычны вобраз Аргона ў камедыі Ж.-Б. Мальера «Тарцюф».
3. Камедыя-балет Ж.-Б. Мальера «Мешчанін у дваранах». Адлюстраванне ў камедыі сацыяльных супярэчнасцей эпохі.
4. Журдэнаўскі ідэал адукаванага і выхаванага чалавека ў камедыі Ж.-Б. Мальера «Мешчанін у дваранах».
5. Асветніцтва ў Англіі. Раман Д. Свіфта «Падарожжы Гулівера».
6. 14. Раман прыгод і падарожжаў Д. Дэфо «Рабінзон Круза».
7. Нямецкае Асветніцтва і асоба І. В. Гётэ.
8. Гісторыя напісання трагедыі «Фаўст» І. В. Гётэ. Структура твора. Пралогі ў творы.
9. Трагедыя «Фаўст» І. В. Гётэ. Пошукі Фаўстам сэнсу жыцця і ўласнага прызначэння. «Спакушэнні» на шляху героя.
10. Вобраз Маргарыты, яго функцыя ў трагедыі «Фаўст» І.В. Гётэ.
11. Выпрабаванні Фаўста ў II частцы твора І.В. Гётэ. Канкрэтна-гістарычны змест і вечны сэнс вобраза Фаўста.
12. Творчасць Ф. Шылера ў кантэксце еўрапейскага Асветніцтва.
13. Раман Ж. Санд «Кансуэла» ў кантэксце рамантызму літаратуры Францыі.
14. Жанр гістарычнага рамана ў творчасці В. Гюго. Раман «Сабор Парыжскай Божай Маці»: зварот да гістарычнага мінулага, нацыянальнай гісторыі.
15. Вобраз мадам дэ Рэналь у раскрыцці ідэі рамана «Чырвонае і чорнае» Ф. Стэндаля.
16. Вобраз Матыльды дэ Ламоль як увасабленне нораваў парыжскага грамадства XIX ст. у рамане «Чырвонае і чорнае» Ф. Стэндаля.
17. Жыццёвы і творчы шлях А. дэ Бальзака.
18. Філасофскі раман А. дэ Бальзака «Шчыгрынавая скура». Эвалюцыя характару галоўнага героя Рафаэля дэ Валантэна.
19. Роля і функцыі жаночых вобразаў у рамане А. дэ Бальзака «Шчыгрынавая скура».
20. Англійскі рэалізм віктарыянскай эпохі. Раман Ш. Брантэ «Джэн Эйр». Праблема выхавання ў творы

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ

1. Фарміраванне асноўных літаратурных кірункаў у XVII ст. Барока як мастацка-эстэтычная сістэма.
2. Барока ў еўрапейскай і беларускай літаратурах: параўнальная характарыстыка.
3. Класіцызм. Прынцыпы класіцызму.
4. Ж.-Б. Мальер: асноўныя этапы жыцця і творчасці.
5. Драматургічная рэформа Ж.-Б. Мальера. Лёс камедыі «Тарцюф». Вобраз галоўнага героя Тарцюфа.
6. Сатырычны вобраз Аргона ў камедыі Ж.-Б. Мальера «Тарцюф».
7. Камедыя-балет Ж.-Б. Мальера «Мешчанін у дваранах». Адлюстраванне ў камедыі сацыяльных супярэчнасцей эпохі.
8. Журдэнаўскі ідэал адукаванага і выхаванага чалавека ў камедыі Ж.-Б. Мальера «Мешчанін у дваранах».
9. Вобразы дваран у камедыі Ж.-Б. Мальера «Мешчанін у дваранах», іх роля ў раскрыцці жыццёвай праўды.
10. Класіцызм у англійскай літаратуры. Паэма Д. Мілтана «Страчаны рай». Вечныя вобразы і матывы.
11. XVIII ст. і яго месца ў гісторыі сусветнай літаратуры. Асветніцтва як комплекс ідэй у культурным руху Еўропы.
12. Асноўныя літаратурныя напрамкі эпохі Асветніцтва: класіцызм, ракако, сентыменталізм. Іх характарыстыка.
13. Асветніцтва ў Англіі. Раман Д. Свіфта «Падарожжы Гулівера».
14. Раман прыгод і падарожжаў Д. Дэфо «Рабінзон Круза».
15. Рабінзанада ў сусветнай і беларускай літаратуры.
16. Асветніцтва ў Францыі. Грамадска-палітычнае значэнне дзейнасці французскіх асветнікаў Вальтэра, Д. Дзідро, Ж.Ж. Русо.
17. Нямецкае Асветніцтва і асоба І. В. Гётэ.
18. Гісторыя напісання трагедыі «Фаўст» І. В. Гётэ. Структура твора. Пралогі ў творы.
19. Трагедыя «Фаўст» І. В. Гётэ. Пошукі Фаўстам сэнсу жыцця і ўласнага прызначэння. «Спакушэнні» на шляху героя (І частка).
20. Вобраз Маргарыты, яго функцыя ў трагедыі «Фаўст» І.В. Гётэ.
21. Выпрабаванні Фаўста ў ІІ частцы твора І.В. Гётэ. Канкрэтна-гістарычны змест і вечны сэнс вобраза Фаўста.
22. Творчасць Ф. Шылера ў кантэксце еўрапейскага Асветніцтва (1 твор на выбар).
23. Сусветная літаратура 1-й пал. XIX ст. Рамантызм як літаратурна-мастацкі накірунак.
24. Казачная проза братоў Грым у кантэксце літаратуры рамантызму (3 творы на выбар).

25. Нямецкі рамантызм. Творчасць Э.Т.А. Гофмана. Фантастычнае і рэальнае ў свеце Гофмана (2 творы на выбар).
26. Лёс мастака і мастацтва ў творах Э.Т.А. Гофмана (2 творы на выбар).
27. Асаблівасці рамантызму ў літаратуры Англіі.
28. В. Скот як заснавальнік жанру гістарычнага рамана (1 твор на выбар).
29. Д. Г. Байран. Жыццёвы і творчы шлях.
30. Байранаўскі рамантычны герой ва ўсходняй паэме «Карсар».
31. Байранаўскі рамантычны герой ва ўсходняй паэме «Гяур»: канцэпцыя асобы.
32. Раман М. Шэлі «Франкенштэйн, або Сучасны Праметэй»: тэматыка і праблематыка.
33. Асаблівасці рамантызму ў літаратуры Францыі.
34. Гістарычны раман у творчасці А. Дзюма (1 твор на выбар).
35. Раман Ж. Санд «Кансуэла» ў кантэксце рамантызму літаратуры Францыі.
36. Жанр гістарычнага рамана ў творчасці В. Гюго. Раман «Сабор Парыжскай Божай Маці»: зварот да гістарычнага мінулага, нацыянальнай гісторыі.
37. Распрацоўка жанру рамана ў творчасці Ф. Купера (1 твор на выбар).
38. Рамантызм у літаратуры Польшчы. Адам Міцкевіч як заснавальнік польскага рамантызму.
39. Рамантызм у літаратуры ЗША. Рамантычнае наватарства Э.А. По ў паэме «Груган» («Ворон»).
40. Пачынальнік жанру дэтэктыўнай прозы Э. А. По. Навелістычнае майстэрства пісьменніка (2 творы на выбар).
41. Адметнасць псіхалагічных навел Э.А. По. (2 творы на выбар).
42. Сацыяльна-гістарычныя ўмовы фарміравання рэалізму ў еўрапейскай літаратуры XIX ст.
43. Асноўныя рысы крытычнага рэалізму ў еўрапейскіх літаратурах.
44. Этапы развіцця рэалізму XIX ст.
45. Рэалізм у літаратуры Францыі. Проза Ф. Стэндаля. Этапы сталення галоўнага героя рамана «Чырвонае і чорнае».
46. Вобраз мадам дэ Рэналь у раскрыцці ідэі рамана «Чырвонае і чорнае» Ф. Стэндаля.
47. Вобраз Матыльды дэ Ламоль як увасабленне нораваў парыжскага грамадства XIX ст. у рамане «Чырвонае і чорнае» Ф. Стэндаля.
48. Жыццёвы і творчы шлях А. дэ Бальзака.
49. Філасофскі раман А. дэ Бальзака «Шчыгрынавая скура». Эвалюцыя характару галоўнага героя Рафаэля дэ Валантэна.
50. Роля і функцыі жаночых вобразаў у рамане А. дэ Бальзака «Шчыгрынавая скура».

51. Навелістычнае майстэрства П. Мерымэ ў творы «Кармэн»: герой, асяроддзе, мараль.

52. Псіхалагічна-сацыяльная навела Г. дэ Мапасана. Спецыфіка мапасанаўскага пейзажу, натуралістычная падрабязнасць, сацыяльная палярызацыя герояў (2 творы на выбар).

53. Тэма кахання ў жанры мапасанаўскай навелы. Псіхалагізм, дэталь-метафара, праблема «рамак».

54. Раман Г. Флабера «Спадарыня Бавары»: тэматыка і праблематыка.

55. Вобраз спадарыні Бавары ў аднайменным рамане Г. Флабера.

56. Раман Ч. Дзікенса «Прыгоды Алівера Твіста»: перамога дабра і пакаранне зла ў творы.

57. «Ярмарка пыхлівасці» У. Тэкерэя: сацыяльна-палітычныя, маральныя праблемы. Спецыфіка «рамана без героя».

58. Англійскі рэалізм віктарыянскай эпохі. Раман Ш. Брантэ «Джэн Эйр». Праблема выхавання ў творы.

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ ВА ЎСТАНОВАХ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

| № | Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|---|
| 1. | ***залічана*** | дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 2. | ***не залічана*** | недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, адказ на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;<br>слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, некампетэнтнасць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, модуля;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з дысцыплінай рабочай праграмы | Кафедра, якая забяспечвае вывучэнне гэтай дысцыпліны | Прапановы кафедры аб зменах у змесце рабочай праграмы | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Уводзіны ў літаратуразнаўства» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Больш увагі надаць вывучэнню жанраў літаратуры класічнага рэалізму | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 29.10.2024 Пратакол № 3 |
| «Гісторыя беларускай літаратуры XVII–XVIII стагоддзяў» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Больш шырока выкарыстоўваць міжпрадметныя сувязі пры вывучэнні літаратуры эпохі Барока і Класіцызму | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 29.10.2024 Пратакол № 3 |
| «Гісторыя беларускай літаратуры XIX стагоддзя» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Больш шырока выкарыстоўваць міжпрадметныя сувязі пры вывучэнні літаратуры рамантызму і рэалізму | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 29.10.2024 Пратакол № 3 |